Працэс контр-рэвалюцыйнай арганізацыі меншавікоў—„саюзнага бюро“ ЦК РСДРП(м)

НА ЛАВЕ ПАДСУДНЫХ— ІІ Інтэрнацыянал сацыял-здраднікаў

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 64 (3968)
СУБОТА, 7 САКАВІКА 1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫНКА

Даны і Абрамовічы рукамі шкоднікаў— банды меншавікоў—Громакаў, Шэраў і К°

прабавалі агнём і мячом інтэрвэнцыі аднавіць капіталізм у краіне дыктатуры пралетарыяту

Шосты ўсесаюзны

Заўтра ў Маскве—сталіцы міжнароднага пралетарыяту—адкрываецца VI зьезд саветаў Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Гістарычная дата. Дата, якая знамянуе сабой амаль двухгадовы пэрыяд разгорнутага будаўніцтва сацыялізму ў краіне дыктатуры рабочае клясы на фоне гіганцкага, усё ўзрастаючага эканамічнага крызісу, ахапіўшага ўвесь капіталістычны сьвет.

Збанкрутавала і попнула, як мыльны пузыр, праваапартуністычная «тэорыйка» аб «арганізаваным капіталізме». Разьлезлася па швох капіталістычная «стабілізацыя». Усе бяз выключэньня краіны капіталу задыхаюцца ў жалезных цісках найглыбейшай эканамічнай дапрэсіі, якая перарастае ўжо ў радзе буржуазных дзяржаў у палітычны крызіс.

«—Расьце цяжар крызісу. Расьце паніка. У Эўропе яшчэ доўга будзе панаваць лёзунг: «Ратуйся хто можа». Кожны цешыцца тым, што суседу яшчэ горш».

Гэты пэсымістычны енк блізкай да Бэнэша праскай буржуазнай «Лидове новины» ярка характарызуе сёньня буржуазны сьвет. Дзесяткі мільёнаў бесрацоўных і новы бесьперапынны рост беспрацоўя, галечы і голаду, рэзкае скарачэньне вытворства і круты катастрафічны рост банкрутства банкаў, разпаўненьне усяе сыстэмы капіталістычнай гаспадаркі,—такава сёньняшняя кан'юнктура сусьветнага капіталізму.

Узрасла як ніколі пагроза ваеннага нападу на Савецкі Саюз. Капіталізм шукае выхаду з тупіка, у які ён загнаны эканамічным крызісам, ва ўзмоцненай падрыхтоўцы крывавай інтэрвэнцыі супроць рэспублікі Саветаў.

Усе сілы сусьветнай буржуазіі ад генэральных штабаў імпэрыялізму да 2 Інтэрнацыяналу міжнародных сацыял-прадаватараў і здраднікаў аб'ядналіся ў сваіх спробах задушыць СССР, які пераможна будуе сацыялізм, заталіць у крыві нашу краіну, якая пераможна ажыцьцяўляе пяцігодку за чатыры гады. Паны рабаўласьнікі і эксплёватары, якія высмоктваюць апошнія соні з мільёнаў працоўных, з агідной нахабнасьцю ўзьнімаюць дзікую, шапёную, бязглуздую кампанію супроць «савецкага дэмпінгу» і быццам-бы «крымусовай працы» ў СССР. Міжнародны капіталізм прабуе рукамі шкоднікаў і меншавікоў арганізаваць інтэрвэнцыю супроць адзінай у сьвеце пралетарскай дзяржавы—СССР, каб сарваць ажыцьцяўленьне пяцігодкі, каб не дапусьціць перамогі сацыялізму ў краіне дыктатуры пралетарыяту.

Але разам з тым расьце і мацнее рэвалюцыйная актыўнасьць рабочых мас усяго сьвету, якія згуртоўваюць свае рады пад кіраўніцтвам Камінтэрну для абароны сваёй сацыялістычнай бацькаўшчыны—СССР, для рашаючых клясавых баёў супроць буржуазіі і сацыял-фашызму, за перамогу надыходзячай сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Да свайго VI усесаюзнага зьезду саветаў СССР прышоў з вялізарнымі перамогамі ў справе будаўніцтва сацыялізму.

Бальшавіцкімі тэмпамі ператвараецца ў сапраўднасьць ленінскі наказ,—дагнаць і перагнаць у найкарацейшы гістарычны тэрмін капіталістычныя краіны.

На базе індустрыялізацыі, гэтай «адзінай базы сацыялізму» (Ленін) мы дасягнулі нябывалага росту на ўсіх франтох і вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Далёка пакінуты зьзаду першапачатковыя намачэньні пяцігадовага пляну. У 1929-30 г. валавая прадукцыя па цяжкай індустрыі СССР дала рост на 10,4 проц. параўнальна з лічбамі, запраектаванымі паводле пяцігодкі. Праграма выпуску валавой прадукцыі па ўсёй саюзнай прамысловасьці параўнальна з першымі намячэньнямі пяцігодкі ў мінулым годзе перавышана на 1.200.000.000 рублёў. За рубяжом стыхійна, штогадзінна расьце беспрацоўе, закрываюцца ўсё новыя і новыя фабрыкі і заводы, бязупынна скарачаецца вытворства ва ўсіх сваіх галінах. У нас, у Савецкім Саюзе, беспрацоўе ліквідавана. У нас асноўным прадпрыемствы пераведзены на 7-гадзінны рабочы дзень. У нас з кожным днём усё больш і больш растуць кадры пралетарыяту, усё новыя і новыя масы ўлёваюцца ў вытворчасьць, на сацыялістычныя прадпрыемствы.

Народны даход СССР характарызуецца бесьперапынным магутным ростам, такім ростам, якога ніколі ня ведала і ня ведае ні адна краіна ў сьвеце. За 1930 год народны даход СССР вырас у 19,9 проц. У 1931 г.—трэцім рашаючым годзе пяцігодкі, народны даход краіны Саветаў дасьць рост ня менш чым на 38,9 проц.

За час ад V да VI усесаюзнага зьезду саветаў калгасы вырасьлі ў восем раз. 33 проц. усіх бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак зруйнавалі межы сваіх індывідуальных паласак і ўжо аб'ядналіся ў калектывы. Галоўныя збожжавыя раёны Савецкага Саюзу стаяць на парозе завяршэньня суцэльнай калектывізацыі. Асноўныя масы сялянства крута павярнулі на шлях сацыялізму, непарыўна зьвязаўшы свой лёс з лёсам рабочай клясы, з разгортваньнем пераможнага калгаснага руху.

На базе суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца кулацтва як кляса, гэты апошні аплот міжнароднай контр-рэвалюцыі ў нашай краіне. Калгаснае сялянства стала цьвёрдай і асноўнай апорай дыктатуры пралетарыяту ў вёсцы. Гэтым самым «у вялізарнейшай меры ўзмацняецца змычка рабочае клясы з сялянствам, пашыраецца фундамант рабоча-сялянскай улады» (з тэзісаў дакладу тав. Якаўлева ўсесаюзнаму зьезду саветаў).

Няўхільнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі ў выніку жорсткай барацьбы супроць вялікадзяржаўнага шавінізму — галоўнай небясьпекі беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавінізму ўсіх народаў забясьпечыла вялізарнейшыя дасягненьні, гігантыя перамогі ў вырашэньні нацыянальнага пытаньня, у будаўніцтве культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце, у разгортваньні культурнай рэвалюцыі.

Адкрыцьцё VI усесаюзнага зьезду супадае з скачэньнем работ X усебеларускага зьезду саветаў. Вынікі X зьезду, які прайшоў пад знакам разгорнутага наступленьня сацыялізму па ўсім фронце, ярка падкрэсьліваюць усе гэтыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР.

X зьезд, які сабраўся і працаваў на парозе VI усесаюзнага зьезду саветаў, абмеркаваў вузлавыя пытаньні нашага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва і намеціў разгорнутую праграму будаўніцтва сацыялізму ў БССР у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Калёнія царызму ў мінулым Савецкая Сацыялістычная Беларусь пры дыктатуры пралетарыяту ператвараецца ў рэспубліку індустрыяльных гігантаў, калгасаў, саўгасаў і агра-камбінатаў. У БССР, як і ва ўсім СССР, ліквідавана беспрацоўе. Створан рад новых галін прамысловасьці, якія моцна рушылі наперад індустрыялізацыю Савецкай Беларусі. Прыватна-капіталістычны сэктар выціснут з цэнзавай прамысловасьці. Па радзе асноўных галін выкананы і значна перавышаны намячэньні пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва. Наша мэталюргічная прамысловасьці дала рост прадукцыі на 118 проц., што перавысіла першапачатковыя намячэньні пяцігодкі на 55,9 проц. Цяпер мы вырабляем складаныя варштаты і машыны. Капітальная рэканструкцыя асноўных заводаў мэталяпрамысловасьці БССР («Камунара», «Энэргіі» і г. д.), пабудова магутных, узброеных найноўшай тэхнікай камбінатаў (Баб-руйскі дрэваапрацоўчы і інш.), новых мэтапюргічных гігантаў (Гомсельмаш), ільназаводаў, электрацэнтраляй і станцый (Белдрэс) у корані зьмяняюць увесь твар народнай гаспадаркі БССР.

У асноўным па капітальным будаўніцтве ў рэспубліканскай прамысловасьці мы з посьпехам завяршаем пяцігодку за чатыры гады. Пад справу індустрыялізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі падведзіцца магутная энэргетычная база. Загулі турбіны Белдрэс, БССР пакрываецца сеткай электрацэнтраляй. Пабудаваны цёплаэлектрацэнтралі ў важнейшых фабрычных цэнтрах — Барысаве, Рэчыцы, Добрушы і г. д. Нябачным тэмпам разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, ахопліваючы ўсё новыя і новыя масы рабочых, работніц, калгаснікаў і аднаасобнікаў — беднякоў і сярэднякоў. У калгасы ўступіла звыш 18 проц. усіх бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак. У адказ інтэрвэнтам расьце і пашыраецца СТАЛІНСКІ ПРЫЗЫЎ У КАЛГАСЫ. Усё вышэй і вышэй узьнімаецца новая магутная хваля калгаснага прыпіву.

Мы разгарнулі нябывалую работу сярод нацыянальных меншасьцяй на аснове правільнага праваядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі. І нядзіўна, што ў нацыянальных раёнах БССР процант калектывізацыі значна вышэй, чым у іншых.

Наперакор шапёнаму супраціўленьню кулацтва і яго агентуры — правых і «левых» апартуністаў, ня гледзячы на спробы Рамзіных, Шэраў, Громакаў і іх субратоў — беларускіх контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў рэстаўраваць капіталізм у нашай краіне, — мы будуем і пабудуем сацыялізм.

Пралічыліся паны інтэрвэнты з французкага генэральнага штабу і «Тэргпрома», якія прабавалі рукамі «прампартыі» зруйнаваць дыктатуру пралетарыяту ў Савецкім Саюзе.

Пралічыліся паны здраднікі з сацыял-фашысцкага 2 Інтэрнацыяналу, якія прабавалі рукамі контр-рэвалюцыйнай меншавіцкай арганізацыі Громана, Суханава і К-о сарваць сацыялістычнае будаўніцтва ў нашай краіне.

Пралічыўся польскі фашызм, які марыў рукамі контр-рэвалюцыйнай зграі беларускіх нацыянал-дэмакратаў Лёсікаў, Ластоўскіх і К-о ператварыць БССР у калёнію польскага імпэрыялізму.

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна і яе бальшавіцкага ЦК краіна Саветаў уступіла ў пэрыяд сацыялізму. Пад кіраўніцтвам партыі Леніна мы завяршым у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі фундамант сацыялістычнай эканомікі СССР. Толькі непрымірымая, бязьлітасная барацьба супроць рэштак трацкістаў, супроць правых і «левых» апартуністаў — здраднікаў рабочае клясы, за лінію партыі, за яе ленінскі ЦК забясьпечыла ўсе нашы посьпехі і перамогі ў справе будаўніцтва сацыялізму.

Здраднік здрадніка бачыць здалёк. Невыпадкова меншавіцкі 2-гі Інтэрнацыянал — авангард шкоднічтва і арганізацыі інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу браў стаўку раней на трацкізм, а потым і на правы ўхіл, якія ліпі ваду на млын рэстаўрацыі капіталізму ў Савецкім Саюзе. І толькі таму, што партыя, разгромілы трацкізм, зруйнаваўшы правы ўхіл, нанёсшы ўдар праваканцкаму блёку, з ленінскай непрымірымасьцю змагалася і змагаецца за чыстату сваёй генэральнай лініі, — у нашай краіне гіганцкімі тэмпамі з посьпехам будуецца сацыялізм, у нашай краіне пяцігодка будзе выканана за чатыры гады.

VI усесаюзны зьезд саветаў падагуліць вынікі сацыялістычнага будаўніцтва і намеціць далейшыя шляхі і задачы пераможнага наступленьня сацыялізму па ўсім фронце. VI усесаюзны зьезд саветаў мабілізуе мільённыя масы рабочае клясы, калгасьнікаў і аднаасобнікаў — беднякоў і сярэднякоў на барацьбу за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за ўмацаваньне органаў пралетарскай дыктатуры — саветаў, за новы ўздым суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыю кулацтва як клясы, за завяршэньне фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР у трэцім годзе пяцігодкі VI усесаюзны зьезд саветаў мабілізуе мільённыя масы рабочае клясы і ўсіх працоўных нашай краіны на барацьбу за тэхніку, за выкарчоўваньне рэштак шкоднічтва, за якасьць прадукцыі, за ліквідацыю прарываў у выкананьні прамфінпляну, за высокія тэмпы сацыялістычнай індустрыялізацыі.

VI усесаюзны зьезд саветаў цьвёрдай рукой накіруе лёкаматыў сацыялістычнага будаўніцтва наперад па пераможным шляху да сацыялізму.

Вячэрняе пасяджэньне 5-га сакавіка

Допыт сьведкі Няк расава

Першым дапытваецца сьведка Няк расаў. Ён мае вялікі стаж служэньня контр-рэвалюцыі. На працяту 12 год да 3-га ліпеня 1917 г. ён быў членам кадэцкай партыі з дня яе існаваньня. З 1909 г. член яе ЦК. Апрача гэтага, ён быў членам Дзяржаўнай Думы, а пасьля таварышом старшыні гэтай думы, таварышом старшыні часовага камітэту дзяржаўнай думы і членам Часовага Ураду. Паступіўшы на савецкую службу, ён зусім не зьмяніў сваіх поглядаў. Таму, працуючы ў Цэнтрасаюзе ў якасьці члена яго праўленьня, ахвотна прыняў з пачатку 1928 г. прапанову аб шкодніцкай рабоце ад члена меншавіцкай контр-рэвалюцыйнай арганізацыі Пятуніна, які працаваў у той час членам праўленьня Цэнтрасаюзу.

Шкодніцкая работа меншавіцкай арганізацыі Цэнтрасаюзу, у прыватнасьці Пятуніна і Няк расава, заключалася ў тым, каб утойваць і процідзеяць правядзеньню клясавай лініі савецкай улады ў галіне забесьпячэньня насельніцтва прамтаварамі. Шкодзілі накіроўвалі тавары пераважна ў тыя раёны, дзе кулацтва і заможныя пласты насельніцтва складаюць больш ці менш значны процант. Гэта моцна біла па збожжазагатоўках і забесьпячэньні прамысловых цэнтраў. Далей сьведка Няк расаў паведамляе аб тым, што ён атрымаў ад Залкінда і Пятуніна больш за 90 тысяч руб. на шкодніцкую работу ў Цэнтрасаюзе. Шкодзілі-меншавікі з Цэнтрасаюзу разам з кадэтам Няк расавым вялі шкодніцкую работу таксама і па будаўніцтве хлебазаводаў і мэханізацыі хлебапячэньня, што адмоўна магло адбіцца на забесьпячэньні прамысловых цэнтраў. У мэтах зрыву плянаў веснавой пасяўкампаніі яны затрымалі набудову збожжахавалень.

Агульны від спэцыяльнага прысутнічаньне Вярхоўнага суда.

Шкодніцкая „пяцігодка“ зрыву індустрыялізацыі

Допыт падсуднага Гінзбурга

Пасьля допыту сьведкі Няк расава суд выклікае падсуднага Гінзбурга. Гэты шкоднік у 1925-27 г., будучы на лесьнікам старшыні прампляну і старшынёй асобнай камісіі па складаньні пяцігодкі прамысловасьці, распрацаваў такую «пяцігодку», якая-б прывяла да зрыву індустрыялізацыі краіны і да значнага зьніжэньня жыцьцёвага ўзроўню рабочай клясы.

Падсудны паведамляе, што па 18-ці асноўных прамтаварах, якія складаюць прадмет важнейшага спажываньня, узровень даваеннага спажываньня павінен быў быць дасягнуты, згодна гэтай «пяцігодкі» толькі ў 1930-31 г. і на 5 проц. перавысіць даваенны ўзровень 1931-32 году. Але гэты нумар меншавіком ня ўдаўся. Праводзячы ў пяцігодцы, што распрацоўвалася ў 1926-27 г., шкодніцкія ўстаноўкі на зьніжэньне тэмпаў, Гінзбург у сваіх афіцыяльных выступленьнях усяляк прабаваў давесьці, шляхам нават фальсыфікацыі вываду каньюнктурных аглядаў нераальнасьць узятых савецкай уладай тэмпаў. Працуючы ў Гіпрамэзе ў якасьці кіраўніка эканамічнай сэкцыі, Гінзбург даваў няправільныя шкодніцкія эканамічныя ацэнкі распрацаваным праектам заводаў мэталапрамысловасьці. Так ён прабаваў затрымаць будаўніцтва і сарваць пашырэньне Магнітагорска і Сталінградзкага трактарнага заводаў.

Допыт падсуднага Громана

Падсудны Громан паказвае, што яго шкодніцкая дзейнасьць у Дзяржпляне заключалася, галоўным чынам, у складаньні заведама няправільных каньюктурна-эканамічных аналізаў становішча народнай гаспадаркі.

Гінзбург: Я зноў пацьвярджаю ўсе паказаньні, якія я даваў аб спатканьні з Абрамовічам Летам 1928 г. у Маскве. Можа быць Абрамовіч гэтым лістом хоча нас выгаравіць, але такога «великодушия» нам ня трэба. Адзіна правільны крок для Абрамовіча — гэта адмовіцца ад контр-рэвалюцыйных дзеяньняў і стаць на шлях разбраеньня адкрыта, тут, перад пралетарскім судом.

Залкінд: Пацьвярджаю суду факт сваіх спатканьняў з Абрамовічам імянна ў тыя даты і ў тых месцах, якія мною паказаны ў маіх паказаньнях. Паколькі я быў у поўнай сьвядомасьці тады і знаходжуся ў поўнай сьвядомасьці цяпер, дык ніякія падтасаваныя дакументы мяне не пераканаюць.

Падсудны Фін-Енатаеўскі заяўляе, што ў маі 1929 г. Громан паказываў яму дакументы, якія сьведчылі аб нядаўнім прабываньні Абрамовіча ў Маскве.

У заключэньне тав. Шпэрнік тлумачыць падсудным аб парадку спрэчак і апошнім слове, якое прадастаўляецца падсудным. Судовае сьледзтва абвяшчаецца скончаным. Абвяшчаецца перапынак. Пасяджэньне спэцыяльнай прысутнасьці аднаўляецца 6-га сакавіка ў 6 гадз. вечара. Пасьля паказаньняў Гвазьдзёва агалашаецца ліст Абрамовіча, а пасьля — допыт падсудных Шэра, Берлацкага і іншых.

Перад скончаньнем судовага сьледзтва спэцыяльная прысутнасьць на хадайніцтве т. Крыленка далучае да справы рад дакументаў і артыкулаў, на якія неабходна будзе спасылацца ў абвінавачай прамове. Сярод гэтых дакументаў фігуруе заява Абрамовіча. У гэтай заяве Абрамовіч паведамляе сваё паказаньне, якое абвешчана на судзе па яго тэлеграме і якое дана пад прысягай аб тым, што ён, Абрамовіч, ні ў ліпені 1928 году ні ў другі які-небудзь час, пасьля 1920 г. у СССР ня быў. Да гэтай заявы прыкладзена таксама пасьведчаньне другой асобы Курта Громана, які са слоў трэцяй асобы, нейкага сацыял-дэмакрата Шварца, пацьвярджае, што Абрамовіч у ліпені месяцы пражываў на курорце ў Плаўэн.

Старшыня тав. Шпэрнік просіць падсудных выказаць свае адносіны да гэтага лісту.

Громан. Калі я цалкам не пазбаўлен разумовых здольнасьцяй і не знаходжуся ў варʼяцкім доме, дык як-бы мне Абрамовіч не даказваў, што я яго ня бачыў, калі я яго бачыў, я ніколі яму не паверу. А што датычыць паказаньня сьведкі, дык можна знайсьці дзесяткі людзей, якія будуць гатовы для поўных мэтаў пацьвердзіць які-небудзь факт, калі-б гэты факт нават і ня меў месца.

Гэты дакумант, — заяўляе Шэр, — зьяўляецца дрэнным элементарным канспірацыйным прыёмам. Мне даводзілася ў мінулыя часы жыць нелегальна ў Расіі і ў той-жа час зусім афіцыяльна ў лічыцца ў адным з гарадоў Заходняй Эўропы. І калі-б я захацеў, дык знайшоў-бы многа асоб, якія-б над прысягай пацьвердзілі каё прабываньне за граніцай. З Абрамовічам я сустрэўся ў Маскве ў 1928 г. Я ўжо паказваў гэта і пацьвярджаю зараз гэта ўпяча раз.

АБРАМОВІЧ Р—натхніцель інтэрвэнцыянісцкіх плянаў контр-рэвалюцыйнай арганізацыі «Саюзнага бюро» ЦК РСДРП меншавікоў.

Канкрэтныя акты шкодніцтва

Падсудныя Гінзбург, Воўкаў і Сакалоўскі ўдакладняюць свае паказаньні, канкрэтызуючы свае паведамленьні аб зробленых імі актах шкодніцтва. Гінзбург паказвае, што яго каньюнктурныя агляды скажалі сапраўднае становішча рэчаў і складалі іх з такім разьлікам, каб дэзарыентаваць кіруючыя гаспадарчыя колы. У прыватнасьці, ён у 1928 г. ацэньваў гаспадарчае становішча такім чынам, што фактычны прырост вытворчасьці супроць папярэдняга году ня можа перавышаць 20 проц. На справе, як вядома, прырост складаў 23 проц.

Гінзбург у сваіх каньюнктурных аглядах ніколі не даваў практычных указаньняў, як перамагчы труднасьці і дабіцца поўнага ажыцьцяўленьня пляну. Гэтым ён выконваў простую дырэктыву меншавіцкай арганізацыі.

Падсудны Воўкаў расказвае аб сваёй шкодніцкай рабоце, якая адмоўна адбівалася на тэмпах машынабудаўніцтва. Падсудны Сакалоўскі лічыць асноўным момантам сваёй шкодніцкай работы, што ён зрываў усе мерапрыемствы, якія-б маглі спрыяць пашырэньню баеўнаводзтва.

Падвудны ШЭР дае паказаньні суду

Амярцьвеньне капіталаў— галоўны мэтад шкодніцтва

Допыт сьведкі Гвазьдзёва

Суд выклікае ў якасьці сьведкі Гвазьдзёва, меншавіка з 1907 г., былога старшыню рабочай групы ў ваенна-прамысловым камітэце і былога міністра працы ўраду Керанскага. Пры савецкай уладзе працаваў у розных аб'яднаньнях ВСНГ СССР — Гомзе, Главэлектра, а пасьля ў Дзяржбанку. Аб існаваньні нелегальнай арганізацыі меншавікоў ён даведаўся ў пачатку 1929 г. Ён быў членам меншавіцкай групы ВСНГ СССР. Канкрэтная шкодніцкая работа яго вводзілася да складаньня паменшанага пляну фінансаваньня электрапрамысловасьці.

У якасьці загадчыка сэктару рэканструкцыі паравоза-вагона-гіэзэле-будаўніцтва ён, складаючы генэральны плян разьвіцьця гэтай галіны прамысловасьці, прадугледзіў лішнія, якія не выклікаліся інтарэсамі народнай гаспадаркі, капітальныя затраты на будаўніцтва непатрэбных заводаў у агульным на 400 млн. руб. Далей ён праектаваў набудову паравоза-будаўнічага заводу, зусім непатрэбную ва ўмовах транспартнай гаспадаркі. Гэта выклікала-б амярцьвеньне капіталу ў 120-130 млн. руб. Такое-ж непатрэбнае будаўніцтва заводаў пасажырскіх вагонаў патрабавала-б лішніх затрат у 40-50 млн. руб.

Падагульваючы свае паказаньні, Гвазьдзёў заяўляе, што лінія меншавіцкай арганізацыі была накіравана на дэзарганізацыю народнай гаспадаркі і стварэньне дыспрапорцыі паміж асобнымі галінамі прамысловасьці. З гэтай мэтай адны пляны складаліся з яўным перавышэньнем, а другія, наадварот, са значным памяншэньнем. Падсудны Воўкаў пацьвярджае паказаньні Гвазьдзёва.

„МЕНШАВІКІ І БУНДАЎЦЫ у адзіным фронце з буржуазіяй і кулацтвам, БУДАВАЛІ СВАЕ НАДЗЕІ НА РАЗБУРЭНЬНЕ САВЕТАЎ“

„Мы патрабуем ад Вярхоўнага суда ўключыць у абвінавачы акт матар'ял аб контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці Бунду і інш. яўрэйскіх „сацыялістычных“ партый і органаў друку“

„Мы патрабуем ад пралетарскага суду суровага пакараньня меншавікоў і бундаўцаў, якія прадаліся капіталу і гандлявалі жыцьцём соцень тысяч рабочых і працоўных СССР“

АДОЗВА РАБОЧЫХ ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАЙ ШВЭЙНАЙ ФАБРЫКІ «КАСТРЫЧНІК» ДА СПЭЦЫЯЛЬНАЙ ПРЫСУТНАСЬЦІ ВЯРХОЎНАГА СУДА НАД «САЮЗНЫМ БЮРО» РСДРП (меншавікоў).

Мы, рабочыя швэйнай фабрыкі «Кастрычнік», заслухаўшы інфармацыю аб судзе над «саюзным бюро» РСДРП (меншавікоў), выказваем сваё абурэньне супроць меншавікоў і бундаўцаў, якія ад імя міжнароднага капіталу і II Інтэрнацыяналу дапамагалі падрыхтоўцы інтэрвэнцыі супроць СССР і шкодніцтву сацыялістычнай прамысловасьці першай у сьвеце сацыялістычнай краіны.

Мы бачылі шлях меншавікоў, «Бунду», «СС», «Поалей-Цыён» і інш. дробна-буржуазных нацыяналістычных і контр-рэвалюцыйных партый. Сярод нас ёсьць шмат старых рабочых, вялізарная частка яўрэйскіх рабочых, якія памятаюць, як меншавікі і бундаўцы прабавалі ў рамесьніцкім Менску ўзяць над сваё крылка яўрэйскіх рабочых. Яны, гэтыя меншавікі і бундаўцы, у той час таварылі аб сацыялізьме, але і тады яны ўжо праводзілі буржуазную і нацыяналістычную работу. А што мы бачылі ў той час, калі наступіла Кастрычніцкая рэвалюцыя. Меншавікі і бундаўцы пайшлі актыўна дапамагаць буржуазнай контр-рэвалюцыі ў барацьбе з савецкай уладай. А што мы бачым зараз, у той час, калі рабочая кляса і ўсе працоўныя Савецкага Саюзу будуюць сацыялізм?

Зараз мы бачым меншавікоў, бундаўцаў і эсэраўцаў на лаве падсудных. Яны стаяць перад пралетарскім судом, як злачынцы супроць пралетарскай рэвалюцыі; гэта яны былі памочнікамі і саюзьнікамі Рамзіных, французкага генштабу, імпэрыялістычнага антысавецкага фронту. Яны прынялі ўсе меры, каб паларваць нашу сацыялістычную бацькаўшчыну.

На лаве падсудных сядзяць не адны меншавікі і бундаўцы, на лаве падсудных сядзіць II Інтэрнацыянал—агентура імпэрыялістычных інтэрвэнтаў; на лаве падсудных сядзіць «Бунд», які зараз зьяўляецца афіцыяльным членам II Інтэрнацыяналу, пралетаўніком якога зьяўляецца Абрамовіч. Меншавікі і бундаўцы дапамагалі падрыхтаваць інтэрвэнцыю,—вось да чаго даводзіць меншавізм і бундызм! І гэта для нас ня новы. Мы бачым, як Бунд у Польшчы і яўрэйска-меншавіцкія і нацыяналістычныя групы ў іншых краінах капіталу ідуць на повадзе фашызму, банкіраў і фінансістаў, служаць антысавецкім кампаніям, трубяць аб савецкім «дэмпінгу», дапамагаюць кампаніі Фіша, крычаць аб «рабскай працы» ў СССР. Бунд узяў на сябе ролю падрыхтоўкі антысавецкага фронту сярод яўрэйскага насельніцтва. «Фольксцайтунг» у Польшчы, яўрэйскі «сацыялістычны» «Форвэртс» у Амэрыцы—гэтыя «сацыялістычныя» органы зьяўляюцца органамі буржуазнай прапаганды, антысавецкага цкаваньня, органамі падрыхтоўкі вайны супроць СССР. Брудныя рукі меншавікоў і бундаўцаў унутры СССР падрыхтоўвалі інтэрвэнцыю, працуючы рука ў руку са сваімі калегамі ў краінах капіталу. Адсячы гэтыя брудныя рукі—гэта наша патрабаваньне пралетарскаму суду.

Меншавікі і бундаўцы, у адзіным фронце з буржуазіяй і кулацтвам, будавалі свае надзеі на зруйнаваньне саветаў. Да гэтага фронту далучыўся нацыянал-дэмакратызм і шавінізм, які асабліва стаў актыўным за апошні час у нас, у БССР, у адказ на пераможнае наступленьне сацыялізму на ўсім фронце. Контр-рэвалюцыйны беларускі нацыянал-дэмакратызм, устанавіўшы сувязь з заграничнымі нацыянал-фашыстамі і фашыстамі, рыхтаваўшы інтэрвэнцыю супроць саветаў, ідзе рука ў руку з яўрэйскім шавінізмам і меншавізмам-бундызмам, яны змыкаюцца ў адзіным фронце з усёй буржуазіяй і кулацтвам, яны падаюць руку заграничнай буржуазіі і ўсім яе падгалоскам. Але гэтыя актыўныя сілы клясавага ворага атрымліваюць рупнуючы адпор, атрымліваюць удар за ўдарам ад пераможнага пралетарыяту, які ідзе пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і атрымлівае перамогу за перамогай на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва.

У абвінавачым акце мы прачыталі, што Абрамовіч зьбіраўся ехаць у Менск для меншавіцкай агітацыі. Нам вядома, што Абрамовіч зьяўляецца пралетаўніком Бунду ў заграничным цэнтры меншавікоў і што ён быў адным з кіраўнікоў Бунду ў царскай Расіі. Меншавік Абрамовіч, відавочна, разьлічваў, што ён застане стары Менск—рамесьніцкі Менск, «цытадэль» Бунду. Але гэтыя надзеі агента інтэрвэнтаў—Абрамовіча ня маюць падставы. Памёр і ўжо ня існуе стары царскі Менск. Менск зараз зьяўляецца сталіцай БССР, цэнтрам сацыялістычнай індустрыі, цытадэляй камунізму.

Мы, рабочыя, зьяўляемся зараз ударнікамі сацыялістычнай чырвонасьцяжнай швэйнай фабрыкі «Кастрычнік», мы налічваем у сваіх радох 35 проц. камуністаў і камсамольцаў, мы зжылі і вытрусілі ў сваіх радох нацыянальную абмежаванасьць; мы рука ў руку працуем, бяз рознасьці нацыянальнасьцяй, мы вядзем рашучую барацьбу супроць усякай вылазкі шавінізму, супроць усякіх бундаўскіх вылазак.

Мы патрабуем ад Вярхоўнага суда ўключыць у абвінавачы акт матар'ял аб контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці Бунду і іншых яўрэйскіх «сацыялістычных» партый і органаў друку. Бунд, які ў 1930 годзе ўступіў у II Інтэрнацыянал, заслужыў ярабіца членам гэтай імпэрыялістычнай агентуры, сваёй антысавецкай работай на працягу свайго існаваньня ў першыя тры гады Кастрычніцкай рэвалюцыі. Мы патрабуем уключыць у абвінавачы акт супроць II Інтэрнацыяналу, меншавізму і Бунду матар'ял аб гэтым пэрыядзе бундаўскай контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці. Орган польскага Бунду—«Ное Фольк цайтунг» бярэ пад сваю абарону меншавікоў—інтэрвэнцыяністкіх агентаў. Ён піша: «Мы-ж ведаем частку абвінавачаных і асуджаных і мы глыбока ўпэўнены, што такія людзі, як Громан, Суханаў і ім падобныя ня толькі зьяўляюцца добрымі сацыялістамі, але яны душой і целам адданы Савецкаму Саюзу («Фольксцайтунг» за 30 лістапада 1930 году). Прадстаўнік польскага Бунду ў выканкоме II Інтэрнацыяналу—Віктар Альтэр прысьвячае артыкул савецкай замежнай палітыцы, дзе ён піша, што зараз стварэцца патройны саюз Расіі, Італіі і Нямеччыны супроць Эўропы і заўляе. «Калі блёк, што праектуецца, ажыцьцёвіцца, дык хто ведае, ці ня прыдзецца рабочай клясе за гэту каалірыю папляціцца новай сусьветнай вайной». Мы патрабуем упісаць у абвінавачы акт таксама і тое, што Бунд вядзе адкрытае цкаваньне супроць Савецкага Саюзу. Сацыялістычны яўрэйскі орган у Амэрыцы «Форвэртс», рэдактар якога нядаўна атрымаў прывітаньне ад II Інтэрнацыяналу і ад Абрамовіча да свайго 70-гадовага юбілею, штодзенна на сваіх калёнках граміць савецкую сыстэму і рыхтуе адзіны фронт супроць краіны сацыялізму. Мы патрабуем таксама і гэта ўключыць у абвінавачы акт супроць меншавікоў і бундаўцаў.

Мы ганьбім злачынцаў-меншавікоў і бундаўцаў, якія разам з буржуазіяй, кулацтвам і замежнымі імпэрыялістамі, пад благаславеньнем II Інтэрнацыяналу рыхтавалі інтэрвэнцыю на нашу сацыялістычную краіну. Мы заклікаем пралетараў усіх краін узьняць голас пратэсту супроць II Інтэрнацыяналу—арганізатара крывавай войнаў супроць Савецкага Саюзу. Мы ўпэўнены, што рабочыя і працоўныя ўсіх краін праз галаву меншавіцкіх і бундаўскіх «правадыроў» будуць зараз яшчэ больш, чым калі-б там ні было, узмацняць саюз з намі, зараз—у момант вялікіх сацыялістычных зрухаў у краіне сацыялізму і страшэннага голаду і беспрацоўя ў капіталістычным «раі» Вандэрвэльдаў і Абрамовічаў.

Мы шлем гарачае прывітаньне АДПУ—вартаўніку пралетарскай дыктатуры, грозному мячу пралетарыяту. Мы патрабуем ад пралетарскага суда жорсткай меры пакараньня меншавікоў і бундаўцаў, якія прадаліся капіталу і гандлявалі жыцьцём соцень тысяч рабочых і працоўных СССР. Няма літасьці гэтым злачынцам. Меч пралетарскай дыктатуры павінен апусьціцца над галавой гэтых агентаў імпэрыялізму.

Няхай жыве пралетарская дыктатура і сацыялістычнае будаўніцтва! Сьмерць інтэрвэнтам і іх агентам!

Пралетары ўсіх краёў, пратэстуйце супроць меншавіцкай контр-рэвалюцыі, ганеце «сацыялістычных» правадыроў, аматайцеся за камунізм, абараняйце Савецкі Саюз ад яго ворагаў!

Допыт падсуднага Воўкава

Выкліканы пасьля Гінзбурга на допыт т. Воўкаў паведамляе аб сваёй шкодніцкай рабоце ў галіне фінансаваньня прамысловасьці. Так, ён прымаў усе меры да зрыву фінансаваньня машынабудаўнічай прамысловасьці, што павінна было павесьці да згортваньня індустрыялізацыі краіны. Контр-рэвалюцыйная група таксама прабавала сарваць правядзеньне крэдытнай

БАЛЬШАВІЦКАЕ ВЫХАВАНЬНЕ МАС— арганічная частка змаганьня за генэральную лінію партыі

„ТЭОРЫЯ СТАНОВІЦЦА БЕСПРАДМЕТНАЙ, КАЛІ ЯНА НЯ ЎВЯЗВАЕЦЦА З РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ПРАКТЫКАЙ, ТАКСАМА ПРАКТЫКА СЬЛЯПАЯ, КАЛІ ЯНА НЕ АСЬВЯТЛЯЕ САБЕ ДАРОГІ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ТЭОРЫЯЙ“ (Сталін).

НЕ ПАЎТАРЫЦЬ ЛЕТАШНІХ ПРАРЫВАЎ, ПАПЯРЭДЗІЦЬ ЗРЫЎ ПАРТВУЧОБЫ

ПРАМОВА САКРАТАРА ЦК КП(б)Б тав. ГЕЯ

НА УСЕБЕЛАРУСКАЙ НАРАДЗЕ ЗАГАДЧЫКАЎ КУЛЬТПРОПАМІ РК КП(б)Б

Таварышы! Перш за ўсё прашу выбачыць мае, што я ня маў магчымасьці ўзнаёміцца з ходам спрэчак па вашай нарадзе. Гэта прымушае мяне быць па магчымасьці максімальна кароткім і абмежавацца толькі некалькімі заўвагамі найбольш актуальнага парадку.

Думаю, што мне ня трэба закранаць агульныя задачы культпрапаботы. Калі-б паставіць пытаньне аб агульных задачах нашай тэарытычнай работы, дык гэта азначала-б необходнасьць складаць прамову на тэму аб задачах усёй партыйнай арганізацыі, бо «...роля перадавога бойца можа выканаць толькі партыя, якая кіруецца перадавой тэорыяй...» (Ленін). Таму дазвольце спыніцца толькі на некаторых спэцыфічных задачах тэарытычнай і культурна-прапагандыцкай работы.

У якіх рамках будзе працякаць уся тэарытычная выхаваўчая работа нашай партыі? Мы з посьпехам акупуем генэральную лінію партыі, настойліва праводзім не ў жыцьцё ў абстаноўцы напружанай і рашучай барацьбы супроць клясавага ворага, супроць яго супраціўленьня нашаму разгорнутаму сацыялістычнаму наступленьню. Адностраваньнем гэтай клясавай барацьбы зьяўляецца нялаўнасьць у радох нашай партыі ўхілаў у бок правага адхрытага апартунізму—галоўнай небясьпекі на даным этапе—і ў бок апартунізму, некалькі прыкрытага «левымі» рэвалюцыйнымі фразамі. У гэтым змаганьні на два фронты супроць генэральнай лініі партыі магутнейшай зброяй зьяўляецца сыстэматычнае тэарытычнае выхаваньне нашага кіруючага актыву, падрыхтоўка актыву да посьпяховай барацьбы з усякімі ўхілямі і хіснаньнямі ад генэральнай лініі партыі.

Вазьмеце практыку работы нашых раённых арганізацый, праверце любы раён. Аб чым гаворыць вопыт работы раённых арганізацый КП(б)Б, які ёсьць у нас у ЦК КП(б)Б? Да поўнай колькасьці кіраўніці асобных раённых партыйных арганізацый, наш актыў, які стаіць на чале партыйнай арганізацыі, на чале ячэйкі, не змагні надыйсьці кранізьня, прычым не змагні правільна надыйсьці не таму, што яны маюць якую-небудзь другую палітычную ацэнку, а таму, што ў іх не хапае дасьведчанага палітычнага кругазіду. Мы гэтымі днямі на насьдзяньні Бюро Цэнтральнага Камітэту слухалі даклад Касьцюковіцкага РК КП(б)Б. У гэтым раёне нездаровыя зьявішчы ў партыйнай арганізацыі ішлі на лініі вельмі крамітыўнай, на лініі засьмечаньня кіруючай арганізацыі чужымі элементамі аж да бандытаў, белага афіцэрства і г. д. Характэрна адзначыць, што гэта засьмечанасьць Касьцюковіцкай раённай партарганізацыі мела месца за продзку ралу гадоў, была, так сказаць, хранічнай. У гэтай раённай арганізацыі працавалі, зразумела, і сумленныя і адданыя члены партыі, але іх невыстарчальная клясавая чуласьць, іх невыстарчальны палітычны ўзровень не дазволілі ім своечасова сыгналізаваць і своечасова рэагаваць на факты гнілога перараджэньня асобных дзеячоў Касьцюковіцкай раённай партыйнай арганізацыі, і іншы раз там, дзе яны візавы актыў хоча ўзяць у большасьці ўпорабку тое ці іншае сказаньне ад лініі партыі, дык ён, актыў, часта падыходзіць да палітычнай ацэнкі гэтага сказаньня вельмі элементарна, вельмі ўпрошчана, заместо таго, каб той ці іншы канкрэтны характэрны факт узняць на належную палітычную вышыню.

Уся сістэма нашага партыйнага тэарытычнага выхаваньня павінна злучаць самую цэсную арганічную ўвязку тэорыі з практыкай, павінна весьці да таго, каб у нас слова не разыходзілася са справай, каб у нас барацьба супроць правага небясьпекі, супроць «левых» зацібаў, супроць прымірэнцтва да ўхілаў, супроць усіляких сказаньняў ленінскай нацыянальнай палітыкі праходзілася на належнай палітычнай вышыні, каб партыйны актыў, уся партыйная арганізацыя ў цэлым, заўсёды карысталіся ў гэтай барацьбе выпрабаванай і выверанай у клясавых баёх зброяй бальшавіцкай марксыцкай тэорыі. Трэба добра памятаць словы правадыра і таварыша нашай партыі тав. Сталіна, што «тэорыя робіцца беспрадметнай, калі яна ня ўвязваецца з рэвалюцыйнай практыкай, таксама і практыка робіцца сьлепой, калі яна не асьвятляе сабе дарогу рэвалюцыйнай тэорыяй».

Цяпер адносна спэцыфічных задач. Што-ж мы ўскладаем на культпроп, чаго-ж мы чакаем ад работнікаў культпропу? Зразумела, перш за ўсё сыстэматычную наладжаную партыйную вучобу, якая ахопіць ўсю партыйную арганізацыю.

Партыйная вучоба ў мінулым годзе ў нас была поўнасьцю сарвана. Калі ў мінулым годзе мы моцна лаялі на зрыў партвучобы некаторыя райкомы, дык асобныя таварышы нічога не знаходзілі лепшага, як бездапаможна разводзіць на ўсе бакі рукамі і па сутнасьці спраны на апартуністычнаму адказваць: «Выбачайце, у нас калектывізацыя, нам, бачыце, за ўсім и аўтнацца». Трэба ў парадку самай жорсткай самакрытыкі адзначыць, што ў мінулым годзе і ЦК быў кінаваты ў тым, што мы не дабіліся рэзкага крутога пералому ў бок замацаваньня сыстэматычнай партвучобы. У гэтым годзе мы гэтай памылкі не паўторым. Аднак, мы маем і ў гэтым годзе рад даных, якія сыгналізуюць аб тым, што партыйная вучоба зноў зрываецца. За зрыў партыйнай вучобы, за апартуністычную недаацэнку яе мы ўдарым як належыць і каго належыць. І калі тав. Чарнушэвіч у сваім даволі вычарпальным і цікавым дакладзе асобны нашіх зрабіў на небходнасьці дабіцца на што-б там ні стала таго, каб з такой-жа бальшавіцкай настойлівасьцю і напорыстасьцю, з якімі змагаемся за выкананьне прамфінпляну, за кожны калектывізаваны гэктар зямлі, мы змагаліся-б і за партыйную вучобу, дык ён, пясуменна, тысячу раз меў рацыю.

Іменна так трэба ставіць пытаньне: паніжэньні, як трэба, без агаворак, без спасыланьняў на «вузкія» месцы і «аб'ектыўныя труднасьці», неабходна дабіцца таго, каб справа партвучобы ня была бясспрытуальнай, ня была пасынкам, была не на правах «прымусовага асартымэнту», а сустаўной, адказьнейшай часткай работы ўсёй партыйнай арганізацыі ў цэлым, кожнай партыйнай ячэйкі ў асобнасьці. Я думаю, што ўсе прысутныя даволі добра ведаюць, што мы досыць патрабуны народ. За справу партыйнай вучобы адказвае, зразумела, кожны райком партыі ў цэлым. Але ёсьць такія спэцыфічныя пытаньні, за якія ў першую чаргу мы будзем патрабаваць адказнасьці з таварышоў, якія працуюць на жніў культфронту; што імі зроблена, якая ініцыятыва імі праяўлена, а ініцыятыва ў цэлым радзе пытаньняў павінна належаць культпроп-работнікам з тым, каб райвом у цэлым стаяў на чале гэтай ініцыятывы. Зрыў на працягу двух год засаб усёй партыйна-выхаваўчай работы азначаў-бы сабою вельмі значнае адставаньне, а адстаючых, як вядома, б'юць і б'юць вельмі моцна!

Мы не жадаем, каб нас білі.

Наадварот! Мы б'ем і будзем біць усіх нашых клясавых ворагаў. Таму нам усім сумеснымі намаганьнямі, намаганьнямі ўсёй партыйнай арганізацыі неабходна пытаньні партыйна-выхаваўчай вучобы паставіць на належную вышыню.

Там, дзе райкомы партыі невыстарчальна ацэньваюць палітычную важнасьць гэтай галіны работы і тым самым плавуць уніз на плыні, там мы з райкому даволі моцна і без усякіх «амністый» напытаем, але ўдульны мы будзем патрабаваць з загадчыкаў культпропамі райкомаў партыі.

Данная праверанага ЦК КП(б)Б абсьледваньня 20 раёнаў на пытаньні партыйнай вучобы малюць вельмі смучны малюнак нашай абломаўшчыны, неаварытлівасьці, правааапартуністычнай стаўкі на самацёк у гэтых адносінах. Вось аб чым гаворыць мова фактаў і лічбаў.

«... Ахоп сеткі партасьветы зьяўляецца нездавальняючым. Ён выражаецца ў сярэднім ад 40-50 проц. (толькі па вестках Вушацкага РК КП(б)Б ахоп раўняецца 100 проц., Рагачоўскага РК—82,5 проц.), а такі раён, як Барысаўскі—пралетарскі, дзе, здавалася-б, ахоп павінен быць найбольшым, ахоплена ўсяго 40,8 проц., у Віцебску—28 проц. Плюс да гэтага ёсьць зьявіні алсеў ад 30 да 40 проц., нездавальняючае наведваньне заняткаў, якое ў сярэднім дасягае ад 70 да 40 проц., а ў асобных раёнах, як Полацкі і Барысаўскі, наведваньне ў сярэднім—толькі 20-25 проц. і нават асобныя школы—на пароге развалу («Дойбаль», «Маяк сацыялізму» —Барысаўскі раён). Лепшая справа а наведваньнем заняткаў у вясковых раёнах. Тыя гурткі, якія забясьпечаны кіраўнікамі, ператвараюць часамі свае заняткі ў агульныя сходы саўгасаў і калгасаў. Адным з недахопаў работы нарэсьтці зьяўляецца парушэньне вызначаных дзён партвучобы, апошнія надзвычай часта зрываюцца ячэйкамі і нават самімі райкомамі (скліканьне сходаў, насяджэньняў, канферэнцый і г. д.), што перашкаджае нармальнаму ходу вучобы. Зрывы вучобы ў некаторых мясцох носяць хранічны характэр (Віцебск—«Дзьвіна»)».

Партыйна-выхаваўчую работу трэба так паставіць, каб яна цесьнейшым чынам была зьвязана з усёй практыкай нашай работы на сацыялістычным будаўніцтве. Нельга партыйна-выхаваўчую работу на ўзьвышці тэарытычнага ўзроўню ажыцьцяляць адным толькі адцятнымі разважаньнямі. Партыйнае, марксыцка-ленінскае выхаваньне павінна быць непарыўна зьвязана з практыкай работы. Зараз нам неабходна ў гэту ўзвязку тэорыі з практыкай увесьці новы момант—момант аўтаданя ня тэхнікай, аб чым гаварыў тав. Сталін у сваёй гістарычнай прамове на ўсесаюзнай нарадзе дырэктароў прадпрыемстваў. Нам трэба партыйна-выхаваўчую сетку і тэарытычную асьвету зьвязаць, пераплесьці з пытаньнямі тэхнічага нарадку, якія-б дазволілі нашым партыйцам разам з надзіцьцем свайго тэарытычнага ўзроўню, разам з замацаваньнем сваёй марксыцкай асьветы таксама атрымаць поўны мінімум тэхнічных ведаў. Я лічу вельмі ўдачнай мысьль нашага культпропу ЦК КП(б)Б аб тым, каб некалькі спэцыялізаваць партыйнае выхаваньне прыстасоўна да эканомічных асаблівасьцяй раёнаў БССР (ільнаводчыя, жывёлагадоўчыя і г. д.) з тым, каб і ў сетцы партвучобы даваць членам партыі сікія-такія веды з галіны ільнаводзтва, жывёлагадоўлі, сьвінагадоўлі, зазастраючы гэтым самым у партыйным асяродзьдзі зацікаўленасьць да гэтых пытаньняў.

Зразумела, мы ня зможам гэтым самым даць тэхнічнай асьветы членам партыі і ня ў гэтым наша задача. Партыйная асьвета ня можа ўзяць на свае плечы такую задачу, наша справа ўздымаць тэарытычны ўзровень, ажыцьцяўляць марксыцка-ленінскае выхаваньне. Але стварань поўную зацікаўленасьць, папулярызуючы самыя элементарныя весткі па сельскай гаспадарцы, па тэхніцы, без якіх нішчат работа немагчыма,—гэта можа і павінна ўзяць на сябе сетка партвучобы.

Значыцца, першае, за што ў нас культпропы павінны адказваць,—гэта пытаньні сыстэматычнай партыйнай асьветы.

Другое, што, мне здаецца, трэба ўскласьці на культпропы,—гэта інтэрнацыянальнае выхаваньне нашай партыйнай арганізацыі.

Я бяру гэтыя словы—інтэрнацыянальнае выхаваньне—у шырокім сэнсе гэтага слова.

Мы знаходзімся на мяжы з капіталістычным сьветам. Таму ў нашай партыйнай арганізацыі ячэй больш, чым у якой-небудзь іншай, павінна быць самае выразнае, яснае пралетарыяльнае аб тым, што робіцца за межамі Савецкага Саюзу, як жывуць і працуюць камуністычныя партыі ў капіталістычных краінах, аб тым, якія задачы стаяць перад рабочай клясай капіталістычных краін.

Фактаў палітычнай нянісьменнасьці, верхаглядзтва і няправільнага блытанага пралетарыяльня ў галіне пытаньняў інтэрнацыянальнага рабочага руху ў нас нямала.

Нядаўна меў месца выпадак, калі цэнтральная камсамольская газэта «Чырвоная зьмена» з выпадковага повалу выступіла з заметкай, якая давала адкрыта правааапартуністычную ўстаноўку ў пытаньнях міжнароднага рабочага руху.

Я схільны верыць, што ў таварышоў, якія працуюць у рэдакцыі газ. «Чырвоная зьмена», гэта здарылася не ад правааапартуністычнай установкі наогул, а ад самай элементарнай, абураючай, недапушчальнай палітычнай нянісьменнасьці. Але... нам ад гэтага не лягчай, факт застаецца фактам, што ў камсамольскай газэце ў даволі ясным пытаньні дапушчана буйная палітычная памылка.

Гэты выпадак паказвае, што сёй-той нават з таго актыву, які стаіць на чале такіх пастох, якія, здавалася-б, патрабуюць элементарных ведаў загранічнага рабочага руху, дапускаюць вельмі буйныя памылкі ў гэтых пытаньнях.

Мы павінны ведаць ня толькі аб тым, што там і там у такіх і такіх капіталістычных краінах зараз адбываецца крызіс, але мы павінны ведаць і спэцыфічныя асаблівасьці становішча ў Нямеччыне, Польшчы, Чэха-Славакіі, Румыніі і т. д., прынамсі, у бліжэйшых да нас краінах. Мы, у прыватнасьці, павінны сыстэматычна знаёміць самыя шырокія колы партыі з работай брацкіх кампартый Зах. Беларусі і Польшчы. Трэба рашуча выкарыніць, навярнуць увагу ўсёй партыйнай арганізацыі да гэрэічнай барацьбы і работы камуністычных партый капіталістычных краін.

Гэты паварот у бок завастрэньня ўвагі да пытаньняў міжнароднага рабочага руху і асабліваснці да пытаньняў палітычнага становішча ў бліжэйшых краінах: у Польшчы, Зах. Беларусі, Нямеччыне (нішта ведаць палітычнай абстаноўкі ў Польшчы, ня ведаючы праблем пралетарскага руху і становішча ў Нямеччыне, Румыніі і Чэха-Славакіі)—зьяўляецца абавязковым. Гэта таксама адна з асноўных задач культпропу, на якой павінен быць зроблен грунтоўны бальшавіцкі ўпор.

Наранце трэцяе пытаньне, на якім я лічу неабходным спынніца,—гэта пытаньне правядзеньня нацыянальнай палітыкі партыі і ў прыватнасьці пытаньні правядзеньня пастаноў Кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б. Мы ў настановах Кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б вельмі ясна і поўна запісалі, што:

«...Рашуча ажыдаючы рэакцыйную тэорыю змаганьня дзьвёх культур, якая льле ваду на млын і паліка-дзяржаўнага і беларускага шавінізму, партыя стаіць за брацкае супрацоўніцтва рабочых і працоўных мас усіх нацыянальнасьцяй ў справе будаўніцтва міжнароднай пралетарскай культуры. На даным этапе ўдзел беларускага пралетарыяту ў справе будаўніцтва міжнароднай пралетарскай культуры заключаецца ў тым, каб разгарнуць у межах БССР пасьляховае будаўніцтва культуры—сацыялістычнай па сваім зьмесьце, нацыянальнай (беларускай)—на сваёй форме. Гэта задача можа быць выканана **толькі пры умове ажыцьцяўленьня неаслабнага партыйнага кіраўніцтва справай культурнага будаўніцтва.** (Падкрэслена намі. К. Г.).

Перад партыйнай арганізацыяй стаіць вялікая задача—арганізаваць і стаць на чале ўцягненьня шырокіх рабочых мас у справу культурнага будаўніцтва і ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі. Рабочыя масы пад кіраўніцтвам партыі павінны ўзяць на сябе ініцыятыву ў вытучэньні беларускай мовы, у ажыцьцяўленьні беларусізацыі дзяржаўнага, гаспадарчага, камэрцыйнага і прафэсіянага апарату, у вытучэньні гісторыі і эканомікі Беларусі і г. д.».

У гэтай-жа настанове пленуму ЦК КП(б)Б мы асобна падкрэслілі, што наша адна з важнейшых задач—гэта забясьпечыць далейшы, яшчэ больш рашучы эрух у рабочай масе і ў радох партыі ў адносінах справы беларусізацыі.

Мы сказалі, што:

«...Неабходны рашучы эрух у справе беларусізацыі партыйнай работы, асабліва ў вышэйшых і сярэдніх зьвеньнях.

Пленум ухваляе ініцыятыву Фрунзаўскага і Кастрычніцкага райкомаў, якія правялі месячнік праверкі беларусізацыі, і прапаную ўсім партыйным арганізацыям павесьці адпаведную работу па праверцы становішча беларусізацыі і работы сярод нацменшасьцяй, аб'яднаўшы яе з масавай растуумачальнай работай аб задачах і мэтах нацыянальнай палітыкі ў БССР. Трэба ўзмацніць змаганьне за поўную беларусізацыю як дзяржаўнага, так і гаспадарчага апарату».

Задача партыйнай арганізацыі ў тым, каб зрабіць далейшы эрух у радох рабочае клясы БССР, забясьпечыць уцягненьне мас рабочых у справу нацыянальна-культурнага будаўніцтва, а без аўладаньня беларускай мовай, без беларусізацыі—удзел у нацыянальна-культурным будаўніцтве немагчымы.

Прымаць удзел у нацыянальна-культурным будаўніцтве могуць і павінны ня толькі беларусы па нараджэньні і пахаджэньні, але могуць і павінны ўсе працоўныя масы. Мы—інтэрнацыяналісты. Але для таго, каб прымаць удзел у нацыянальна-культурным будаўніцтве, трэба ведаць мову.

Рабочая кляса БССР у сілу гістарычных умоў складаецца з 40 проц. беларусаў па пахаджэньні, прычым поўная частка гэтых 40 проц. ня вельмі добра ведае беларускую мову, а 60 проц. агульнага ліку рабочай клясы складаецца з рабочых іншых нацыянальнасьцяй. Таму зусім зразумела, што сапраўднае пралетарскае кіраўніцтва справай нацыянальна-культурнага будаўніцтва мы зможам забясьпечыць толькі тады, калі зробім далейшы рашучы эрух у рабоце па беларусізацыі рабочай клясы, будуючы гэту работу на добрахвотных пачатках, зацікаўліваючы партыйную і беспартыйную рабочую масу аўладаньнем беларускай мовай, запікаўліваючы іх у настаноўцы праблем навуковай работы.

Чаму кампартыя Украіны змагла дабіцца значнага пералому ў масах дапбасаўскіх шахцёраў і ў іншых пралетарскіх цэнтрах, калі мы маем з боку рабочай клясы на Украіне, з боку рабочых арганізацый на Украіне цэлы рад актыўных мерапрыемстваў у правядзеньні украінізацыі, у ажыцьцяўленьні нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

На нядаўняй нарадзе сакратароў партыйных вытворчых ячэек мне прыпалося высунуць поўнае абвінавачаньне сакратаром партыйных ячэек, што ў нас настанова Кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б на нацыянальнай палітыцы ў значнай частцы ячэек праводзіцца ў жыцьцё вельмі дрэнна.

І я думаю, што ініцыятыва пастаноўкі нацыянальнага пытаньня, ініцыятыва работы па нацыянальным культурным будаўніцтве, ініцыятыва ўцягненьня партыйных мас у справу беларусізацыі на прадпрыемстве, там, дзе ў нас беларуская мова ўсё яшчэ ня так шырока прыпчапляецца,—павінна быць таксама ўскладзена і на культпропы.

Тут таксама, як і ў іншых пытаньнях адзелы культуры і прапаганды павінны праявіць ініцыятыву, узяць гэту ініцыятыву ў свае рукі, павінны патрабаваць ад партарганізацый, каб пастановы Кастрычніцкага пленуму не засталіся на паперы, а рашуча і пасьлядоўна праводзіліся ў жыцьцё.

На гэтым дазвольце скончыць мае вельмі кароткае слова. (Бурныя воплескі).

Нарада пры ЦК КП(б)Б па партасьвеце

Школы партасьветы—на правядзеньне другой калгаснай вясны

5 сакавіка нарада абмеркавала анэтыяе пытаньне нарадку дня — даклад тав. Гаеўскага аб веснавой пасеўнай кампаніі і партвучобе.

— У пасьняховым выкананьні задач, вызначаных партыяй на 1931 год па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, — гаворыць тав. Гаеўскі, — рашаючае значэньне будзе мець бальшавіцкая падрыхтоўка і правядзеньне сёлетняй веснавой пасеўнай кампаніі. У веснавую пасеўную кампанію на БССР мы павінны дасягнуць 30 проц. калектывізацыі бадняцка - серадняцкіх гаспадарак, значна ўзьнішць процант тавернай прадукцыі калгасаў і саўгасаў, пашырыць плошчу правога ільну на 17,4 проц. Правесьці спэцыялізацыю раённаў у бок пашырэньня жывёлагадоўлі, у бок стварэньня патрэбнай кармавой базы і г. д.

Выкананьне гэтых задач забясьпечваецца тымі посьпехамі, якія мы маем у галіне індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі за першыя 2 гады пяцігодкі. Зразумела было-б зусім няправільным лічыць, што гэтыя задачы, паставленыя пленумам ЦК партыі, могуць быць выкананы апартуністычнай стаўкай на самацёк, ці «лявацкімі» заскокамі і загібамі. Пасьняховае правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі патрабуе максімальнай напружанасьці ў рабоце ўсіх зьвеньняў партыйнай арганізацыі, патрабуе мабілізацыі шырокіх калгасных і бядняцка-серадняцкіх аднаасобных мас. Барацьба за бальшавіцкае правядзеньне веснавой сяўбы — гэта барацьба за далейшы посьпехі ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, за ліквідацыю кулацка як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі, за запрыпаньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

У сувязі з веснавой пасеўнай кампаніяй вялікая задача ўскладаецца на ўсю сетку партыйнай асьветы. Сучасны этап сацыялістычнага будаўніцтва характарызуецца разгорнутым наступленьнем па ўсім фронце на капіталістычныя элементы, абвастрэньнем клясавага змаганьня, задачамі рашучай барацьбы з ухілямі ад генэральнай лініі партыі. Галоўная задача партыйнай вучобы заключаецца ў тым, каб даць сьвядомага барацьбіта за генэральную лінію партыі, стойкага, змагчытага падрыхтаванага камуніста, здольнага цьвёрда праводзіць партыйную лінію ў сваёй практычнай рабоце. Увязваючы пытаньне партыйнай вучобы з задачамі другой калгаснай вясны, мы павінны падпарадкаваць зараз работу школ партасьветы тым задачам, якія пастаўлены партыяй на правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі.

Праведзеныя абсьледваньнем Культпропам ЦК вынулена, што многія школы і гурткі партыйнай асьветы вельмі невыстарчальна ўвязваюць сваю работу з выкананьнем бягучых гаспадарча-палітычных кампаній. Да гэтага часу многія школы не зьяўляюцца начальнікамі ў правядзеньні тых ці іншых задач, не мабілізуюць сваіх слухачоў, а праз іх і шырокія працоўныя масы на выкананьне прамфінпляну, на выкананьне задач на калектывізацыі, на правядзеньні гаспадарча - палітычных кампаній. Для характарыстыкі такога становішча падамо некалькі прыкладаў. На чыгунцы партшкола прапрацоўвае адозву ЦК УсеКП(б) і СНК аб перабудове работы на транспарце. Прапрацоўка гэта праводзіцца фармальна: кіраўнік прачытаў, а ўдзельнікі заняткаў праслухалі; ніякіх пытаньняў, ніякага абмеркаваньня ў бок засьвячэньня рэалізацыі гэтай адозвы ня было. Прапрацоўваючы на занятках партшколы (Лепельскі раён) тэму: «Пераходны пэрыяд ад капіталізму да сацыялізму», кіраўнік гуртка даў характарыстыку пераходнаму пэрыяду, сказаў, якая розьніца паміж сацыялізмам і камунізмам і на гэтым абмежаваўся. Прапрацоўка гэтай тэмы ніводным словам ня была зьвязана з сучаснасьцю. Гэта не адзіночныя выпадкі. Рад школ зусім адарвана прапрацоўваюць пытаньні праграмы з пытаньнямі бягучай палітыкі. Замест увязкі пытаньняў прамысловасьці, сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і інш. задач сацыялістычнага будаўніцтва з праграмай, мы маем такое зьявішча, што праграмныя пытаньні прапрацоўваюцца асобна. Праўда, у рабоце некаторых школ і гурткоў ёсьць імкненьні да ўвязкі пытаньняў праграмы з бягучай палітыкай, але праводзіцца гэта далёка не ў выстарчальнай меры.

Мы маем недапушчальныя адносіны з боку некаторых райкомаў да пытаньня арганізацыі партвучобы і ўвязкі яе з кампаніяй работай. Многія райкомы, налагуньваючы выніхі розных галін работы, даюць правільны аналіз, вызначаюць канкрэтныя мерапрыемствы для ліквідацыі недахопаў і прарываў у рабоце, але ні ў якай меры не закранаюць пытаньня партыйнай асьветы, як аднаго з важнейшых мэтадаў дапамогі у практычнай рабоце.

Канкрэтны ўдзел сеткі партасьветы, асабліва вясковых раёнаў, у веснавой пасеўнай кампаніі павінен заключацца ў неадкладным пераключэньні работы ў адпаведнасьці з тымі задачамі, што вызначаны партыяй. Наш прапагандыст павінен быць добра знаём з пытаньнямі бягучай палітыкі, ён павінен добра ведаць тэарытычны і практычны матар'ял аб пасеўнай кампаніі і быць здольным выкладаць гэты матар'ял у школе, у гуртку ў праламленьні практычнага выкананьня сваіх абавязкаў слухачамі. Неабходна зараз-жа паставіць пытаньне аб арганізацыі ў раёнах кароткатэрміновых курсаў прапагандыстаў, на якіх трэба глыбока прапрацаваць матар'ялы па пасеўнай кампаніі, на калектывізацыі сельскай гаспадаркі, арганізацыі МТС, кантрактацыі і г. д. Побач з гэтым трэба абавязкова арганізаваць заняткі на прапрацоўцы матар'ялаў аб веснавой пасеўнай кампаніі з тымі камуністамі, што не ахоплены сеткай партасьветы. Гэтыя-ж матар'ялы — пытаньне веснавой пасеўнай кампаніі — таксама неабходна прапрацаваць на лініі ўсіх існучых у раёне курсаў прафсаюзных, каапэрацыйных і калгасных. Трэба дабіцца таго, каб кожны слухач сеткі партасьветы быў сапраўдным агітатарам і прапагандыстам за бальшавіцкую вясну, за калектывізацыю.

Выніхі работы кожнай школы, кожнага гуртка ацэньваюцца ня толькі на процанце наведваньня заняткаў слухачамі, а галоўнае на тым, якую канкрэтную дапамогу яны аказалі ячэйкам у правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі.

* * *

Пасьля абмеркаваньня гэтага пытаньня нарада закрылася.

Напярэдадні 8-га сакавіка

Менскія работніцы рыхтуюцца

(Па матар'ялах рэйду брыгад „Беларускай работніцы і селянкі“)

Рэдакцыя часопісі «Беларуская работніца і селянка» напярэдадні 8-га сакавіка праз рэйд брыгада правяла праверку падрыхтоўкі да правядзеньня Міжнароднага камуністычнага жаночага дня і становішча палітычна - масавай работы сярод работніц.

На заводзе «Бальшавік» брыгада ў складзе Нехамавай, Новікавай і Чаркасавай, выявіла:

— За апошні год колькасьць работніц на прадпрыемстве павялічылася. У пачатку мінулага году работніц было 118, а ў канцы году налічваюцца 152 работніцы. Прадукцыйнасьць працы работніц на нікэй прадукцыйнасьці рабочых мужчын. Па набіўцы на рамы ў першым хромавым цэху работніцы не адстаюць ад мужчын, а на абрэзцы і прасоўцы работніцы нават ідуць наперадзе. Работніцы на абрэзцы выконваюць прамфінпляк больш за рабочых на 10 проц., а па прасоўцы—на 15-18 процантаў.

Разам з гэтымі посьпехамі ёсьць бязаумоўна, і адмоўныя зьявішчы. Яны заключаюцца ў тым, што сярод работніц не ліквідаваны прагулы і спазьненьні на работу.

На шэйнай фабрыцы «Кастрычнік» правяраала брыгада ў складзе т. т. Барнан, Падольскай і Міндлінай. На «Кастрычніку» колькасьць работніц за мінулы год вырасла на 300 з лішнім чал. Кваліфікацыя жанчын ва многім не адстае ад кваліфікацыі мужчын. Падрыхтоўка, павышэньне кваліфікацыі жанчын адбываецца марудна. Толькі зараз на тэхнічныя курсы вылучаецца 5 работніц і на прафкурсы 2 работніцы. Вылучэньне па адміністрацыйна - кіруючую работу таксама адбываецца слаба. Вылучана толькі 7 чалавек.

Ударніцтвам ахоплена каля 70 проц. работніц. Але трэба падкрэсьліць, што на фабрыцы некалькі мэханічна адбываецца заклік работніц ва ўдарныя брыгады. За апошні год прэміявана толькі 23 работніцы з агульнага ліку 123 прэміяваных.

За апошні год палітычна - масавая работа сярод жанчын аслабла. Нававыбраны склад дэлегатак ня прыступіў яшчэ да работы. Выхаваўчай работы сярод жанчын не видзецца. Асабліва недапушчальна тое, што нават не правялося ні адзін сход з тымі работніцамі, якія падаўна ўліліся ў вытворчасьць. Бытавыя ўмовы работніц лічыць здавальняючымі нельзя. Ёсьць ясьлі, развіваныя на 100 месц. Зьмяшчаюцца яны ў вельмі дасным будынку і ня могуць забясьпечыць санатрабаваньняў работніц.

Падрыхтоўка да 8-га сакавіка распачата з вялікім спазьненьнем. Брыгада не знайшла канкрэтнага плану правядзеньня сьвята. У Міжнародны жаночы дзень вызначана для прэміраваньня 30 работніц за ўдарную работу і за ліквідацыю нянісьменнасьці 5 работніц. Арганізавалася «сяброўская» брыгада імя 8-га сакавіка.

Ніхто не паказаць на тое, што ў ленінскі набор 130 работніц падалі заявы аб уступленьні ў партыю і 8 работніц з «Кастрычніка» выбраны ў гарэвасы.

Брыгадзір тав. Вайнштэйн прапрацала стая падрыхтоўкі да 8-га сакавіка па ЖАКЦЕ № 7. Там арганізаваны гурткі: шэйны, першай дапамогі, па ліквідацыі нянісьменнасьці і г. д. Падрыхтоўка да 8-га сакавіка разгорнута досыць шырока. Міркуецца адкрыць дзіцячы пакой, што дасьць магчымасьць працоўным жанчынам удзельнічаць у грамадскай рабоце.

Культурна - масавая работа паставлена нядрэнна. Жанчыны падпісаліся на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» на суму 1.130 руб.

На фабрыцы «Камунарка» брыгада ў складзе т. т. Шашкоўскай і Верамчук, знайшла, што палітычна - выхаваўчая работа сярод работніц паставлена слаба. На гэтай фабрыцы 500 работніц. Ёсьць 5 узорных брыгад, у якія ўваходзіць 80 чал., а таксама курсы для азнаямленьня новапрынятых на работу з працэсамі вытворчасьці. Вылучана 40 работніц для пераквалёфікацыі. Прыфабрыцы праектуецца адкрыць дзіцячыя ясьлі на 40 месц. Гэта далёка не забясьпечвае запатрабаваньняў, паколькі на фабрыцы працуюць выключна жанчыны. На адміністрацыйна - кіруючых пасадах амаль усе жанчыны, былыя работніцы гэтай-жа фабрыкі. Зараз створаны 2 брыгады імя 8-га сакавіка і 16 лепшых ударніц вызначаны для прэміраваньня.

Дэлегаткі правяраюць падрыхтаванасьць да сяўбы

Дэлегаткі м. Ельск на сваім агульным сходзе, прысьвечаным падрыхтоўцы да 8-га сакавіка, пастанавілі стварыць брыгаду для праверкі падрыхтаванасьці да веснавой сяўбы. Разам з гэтым дэлегаткі прыступілі да работы па арганізацыі калгасу ў вёсцы Клінок. У гэты калгас ужо запісалася некалькі дэлегатак.

Нараўлянская.

Расьце сетка бытавых устаноў

Міжнародны камуністычны жаночы дзень у ВУЛЬСКІМ РАЁНЕ адзначаецца арганізацыяй новых бытавых устаноў. Па лініі камісарыяту аховы здароўя мяркуецца адкрыць 4 пастаянных і 6 часовых ясьляй. Па лініі Наркамасьветы адкрываюцца 4 дзіцячыя пляцоўкі і адзін прымітыў. Каапэрацыя адкрывае 2 ясьляй. Усе гэтыя установы адкрываюцца пры калгасах і тых сельсаветах, дзе больш за ўсё разгорнута калектывізацыя з тым, каб даць магчымасьць калгасьніцы актыўна ўдзельнічаць у правядзеньні веснавой сяўбы.

А. М-ці.

Ты скажы нам, гадзіна, колькі табе дадзена

Былы дэпутат Грамады Ф. Акінчыц выпусьціў брашуру пад назвай: «Чаму гэта так сталася», у якой ён прабуе вытлумачыць прычыны адъезду заграніцу б. дэпутатаў Тарашкевіча — у Берлін, Рак-Міхайлоўскага, Бурсэвіча і Мятлы — у БССР і даць свае адносіны да гэтага. Гэта брашура сама па сабе ня мае ніякай каштоўнасьці (цаны яна таксама, да рэчы, ня мае, відавочна, фашысты дадумова не распаўсюджваюць). Заслугоўвае яна ўвагі з пункту погляду самавыкрыцьця аўтара. Некалькі слоў аб ім самім.

«Пазбаўлены ўсіх правоў, маю на руках чырвоны «воўчы пашпарт» і жыву ў недастатках, у кожную мінуту могуць схапіць і пасадзіць ізноў у вастрог» — так сябе характарызуе сам Акінчыц. Але ён толькі апранае маску «пазбаўленага правоў», каб знайсьці падыход да прапоўных Заходняй Беларусі. Як відаць, ня ўсіх правоў ён яшчэ пазбаўлен: можа, напрыклад, друкаваць кніжкі, брашуры; гэтага права ў Польшчы пазбаўлены КПП, КПЗБ — прадстаўнікі пралетарыяту, ППС-ляціца, пазбаўлена ТБШ, пазбаўлен беларускі пасольскі клюб «Змаганьне» — пазбаўлены, словам, пралетарыят і сялянства, пазбаўлены арганізацыі нацыянальна-вызваленчага руху. А Акінчыц не пазбаўлен гэтага права. «Я — адзін з арганізатараў Грамады» — піша Акінчыц. «Я не належу да тых паноў (гутарка

ЗАСЕЯЦЬ ПАД ЛЁН І КАНОПЛІ 280.000 ГЭКТ., ЗАКАНТРАКТАВАЦЬ 208.000 ГЭКТ— НІ АДНАГО ГЭКТАРА МЕНШ!

КАЛГАС „ГІГАНТ" рапартуе Ўсесаюзнаму зьезду саветаў аб гатоўнасьці да сяўбы

Арганічнай увязкай калектывізацыі з ажыцьцяўленьнем вытворчых пасеўных мерапрыемстваў забясьпечым пасьпяховае выкананьне праграмы другой бальшавіцкай вясны

Калгас „Гігант" арганізаваў пробны выезд у поле

ПОЛАЦАК (Наш кар.).

Да ўсесаюзнага зьезду саветаў калгас «ГІГАНТ», Банрскага сельсавету, Полацкага раёну, поўнасьцю скончыў падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

Калгас першы ў БССР арганізаваў пробны выезд у поле.

Выезд паказаў поўную падрыхтаванасьць калгасу. С.-г. інвэнтар адрамантаваны поўнасьцю. Збруя падлатана. Налёсы ў спраўнасьці. Складзены насеньня страхавыя, фуражныя фонды. Усе калгасьнікі разьбіты на брыгады і расстаўлены па сваіх мясцох.

Ударная падрыхтоўка калгасьнікаў выклікала прыліў у калгас.

Выявілася, што калгас імя Варашылава, які прыняў выклік калгасу «Гігант» на сацпаборніцтва па падрыхтоўцы да вясны, ня выканаў узятых абавязкаў. У сувязі з гэтым калгас «Гігант» парашыў узяць калгас імя Варашылава на буксір. А. Ц.

13 КАЛГАСАЎ СТАЛІНСКАГА ПРЫЗЫВУ

РАГАЧОЎ.

За дні сталінскага прызыву па раёне АРГАНІЗАВАНА 13 НОВЫХ КАЛГАСАЎ, у якія ўступіла 208 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Уліпоўся ў старыя калгасы 69 гаспадарак.

За ўвесь тыдзень арганізавана 19 новых калгасаў, у якіх ўступіла больш 300 гаспадарак.

Рад партыйных ячэек, сельсаветаў і калгасаў у выніку шырока праведзенай масавай работы дабіліся вялікіх посьпехаў. Так, КІСЬЦЯНЕЎСКАЯ ПАРТ'ЯЧЭЙКА АРГАНІЗАВАЛА 5 НОВЫХ КАЛГАСАЎ з 96 гаспадарак. Процант калектывізацыі па Кісьцянеўскім сельсавеце ЎЗРОС З 13 ДА 42.

У ПРЫБОРСКІМ І МІРКУЛАЎСКІМ СЕЛЬСАВЕТАХ АРГАНІЗАВАНА 6 НОВЫХ КАЛГАСАЎ. У гэтых сельсаветах АМАЛЬ ВА ЎСІХ ВЕСКАХ АРГАНІЗАВАНЫ ІНІЦЫЯТЫЎНЫЯ ГРУПЫ, якія перарастаюць у калгасы. Процант калектывізацыі за пяты ўзрос з 15-17 да 35.

У Асадзіцкім сельсавеце, які ўключыўся ў сталінскі прызыў, БЕДНАТА І СЕРАДНЯКІ АРГАНІЗАВАЛІ 3 НОВЫЯ КАЛГАСЫ, у якія ўступіла 46 гаспадарак.

Значныя посьпехі ў калектывізацыі ёсьць і па СТРАДАКОЎСКІМ сельсавеце, у якім за апошнія 7 дзён арганізаваны 2 НОВЫЯ КАЛГАСЫ з 34 гаспадаркі і ўцягнуты ў старыя калгасы 44 гаспадаркі.

Побач з такімі добрымі прыкладамі работы ёсьць І ТАКІЯ СЕЛЬСАВЕТЫ, ДЗЕ Ў ВЫНІКУ АПАРТУНІСТЫЧНАЙ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦІ МЯСЦОВЫХ ПАРТЫЙНЫХ І САВЕЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ АМАЛЬ НЯМА НІЯКАГА ЗРУХУ Ў КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ. ТАК, КРУШЫНАЎСКІ І ЗАБАЛОЦКІ сельсаветы не ўцягнулі ў калгасы ніводнай гаспадаркі. ГАРАДЗЕЦКІ сельсавет за 4 месяцы вырас толькі на 6 гаспадарак, Сьвяржанскі—на 3 і Гадзіпаўскі—на 5 гаспадарак. ПАДРЫХТОЎКА ДА СЯЎБЫ Ў ГЭТЫХ СЕЛЬСАВЕТАХ ПРАХОДЗІЦЬ ВЕЛЬМІ СЛАБА.

Бюро Крушынскага райкому КП(б)Б за прававартыністычную практыку зьняло з работы сакратара Горацкай парт'ячэйкі тав. ДАНІЛАВА. Сакратару Крушынаўскай ячэйкі абвешчана суровая вымова з папярджаньнем, а сакратаром Забалоцкай, Гадзіпаўскай і Сьвяржанскай ячэек абвешчана вымова.

Райком партыі абавязаў усе парт'ячэйкі і ўпаўнаважаных РК у дзялу пераверкі ліквідаваць усе прарывы ў падрыхтоўцы да сяўбы, арганізацыйна і гаспадарча замацаваць новыя калгасы і шырэй разгарнуць масавую работу вакол сталінскага прызыву ў калгасы, вядучы барацьбу з кулацтвам і яго агентурай—правымі апартуністамі і «левымі» загібшчыкамі.

САЛАДУХІН.

120 камсамольцаў ф-кі „Дзьвіна" на дапамогу пасеўнай

ВІЦЕБСК. (Наш кар.).

Брыгады выявілі, што толькі некаторыя арганізацыі па-баявому перакінуліся на падрыхтоўку да веснавой кампаніі і праводзяць у гэтай галіне адпаведную практычную работу.

Створан штаб, які кіруе ўсёй падрыхтоўчай работай да веснавой сяўбы. Для работы ў вёсцы мабілізавана 350 чал. прафактыву. Камсамольская ячэйка фабрыкі «Дзьвіна» паслала ў дапамогу прыгарадным гаспадаркам 120 камсамольцаў. Камсамольцы і піянеры выбіраюць попел.

Газета «Віцебскі пралетарый» прыкліча шараду рабкораў, якія ўключыліся ў брыгады с.-г. сэкцыі гарсавету і пазраваны ў прыгарадныя гаспадаркі.

Не аддае належнай увагі пасеўнай кампаніі гарсавет, які на вызначыў нават пункта'ў здачы попелу. Гарсавет не рэагаваў на заявы заўкому лесазаводу «Сьцяг індустрыялізацыі» аб адводзе зямлі для самадзейных агародаў.

Трэба адзначыць добрую работу актыву **«Чырвонага мэталіста»**, які вывез у падшэфны саўгас Андронавічы гной і рамантуе с.-г. інвэнтар.

Не аказвае дапамогі падшэфнаму саўгасу Білёва завод «Камінтэрн».

А. ЗАРУБЕЖНЫ.

Па Аршанскім, Сьмілавіцкім, Расьнянскім і Стара-Дароскім раёнах
падрыхтоўка да сяўбы зусім нездавальняючая

Заслухаўшы даклад загадчыка райва Аршанскага, Сьмілавіцкага, Расьнянскага і Стара-Дароскага раёнаў і заключнае пасяджэньне НКЗ БССР, аб падрыхтоўцы да сяўбы і калектывізацыі, калегія Наркомзага Камісарыяту Земляробства адзначыла наступнае:

Падрыхтоўка да сяўбы і работа па калектывізацыі ў гэтых раёнах пастаўлены абсалютна нездавальняюча, прычым асабліва дрэнна ў Аршанскім і Расьнянскім раёнах.

Тамсама нездавальняючай праходзіць мабілізацыя сродкаў на будаўніцтва машына-трактарных станцый. Асабліва дрэнна настаўлена гэта работа ў Стара-Дароскім раёне, амэльным адлегла ня толькі ня крыкаў палосных захадаў, але навет ня водае кантрольнага заданьня.

Зямлеўпарадкаваньне і зямлеўпарадкаваньне калгасаў не пастаўлены ў цэнтр увагі работы земаддзелаў і зямлеўпарадчага пэрсаналу. У выніку отварэцца пагроза сваячасоваму адводу зямель калгасам і пасобным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам.

Калегія НКЗ пастанавіла:

Прапанаваць адпаведным райва на працягу дзвюх дзесяцідзён пляны пасеўных плошчаў да калгасаў і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у парадку сакмабілізацыі і кулацка-самакіных у парадку цьвёрдых заданьняў і правесьці осыпку насенных фондаў у калгасах і страхавых фондаў у калгасах і пасеўнічах.

Абавязаць райва, райкалгасаюзы і райкомасаюзы прыняць усе захады да арганізаванага сельска-гаспадарчых машын і мінэральных угнаеньняў да калгасаў, а таксама мабілізацыі сродкаў у калгасах і бядняцка-серадняцкіх гаспадарках на будаўніцтва.

У сувязі з зусім нездавальняючай падрыхтоўкай да сельска-гаспадарчай кампаніі і работай па калектывізацыі, паставіць пытаньне перад аршанскай і расьнянскай райарганізацыямі аб умацаваньні кіраўніцтва райземаддзелаў.

За непрыняцьце мер да мабілізацыі сродкаў на будаўніцтва МТС абвясьціць вымову загадчыку Стара-Дароскага райва тав. Бецінаву, папярэдзіўшы райва ў апошні раз, што непрыняцьце мер у бліжэйшую дэкаду на мабілізацыі сродкаў прымусіць НКЗ паставіць пытаньне аб пераносе будаўніцтва МТС у другі раён.

Абавязаць сэктар зямлеўпарадкаваньня НКЗ і наралічаныя райва прыняць усе захады да правядзеньня зямлеўпарадкаваньня калгасаў.

Скарачаюць плян сяўбы тэхкультур

СЛУЦАК (Наш кар.).

Пляны веснавой насеўнай кампаніі даведзены амаль да ўсіх насельніцкіх пунктаў. Пераважная большасьць сельсаветаў прыняла кантрольныя лічбы райва бяз зьмен. Адтак, пасобныя сельсаветы—Агародніцкі, Мяцешнаўскі і пасобныя вёскі педдаданцы ўсёй пажнасьці пашырэньня насеўнай плошчы пагул і пад тэхнічнымі і кармавымі культурамі—у прыватнасьці. У Мяцешнаўскім сельсавеце насеўны плян прыняты са зьмяншэньнем плошчы на 220 гэкт., а ў Агародніцкім зьніжана плошча ільну, канапель і бульбы. Гэта вынік таго, што кулацкай агітацыі ня была процідастаўлена належная масавая работа.

Насеўныя пляны амаль нідзе не даведзены да пасобных двароў. Да гэтай работы прыступіў толькі Ленінскі сельсавет, які даўёў плян да кожнага бядняцка-серадняцкага двара ў нарадку самазабавязацельству на 6 насельніцкіх пунктах і да ўсіх заможна-кулацкіх двароў у парадку цьвёрдых заданьняў. У рэшце сельсаветаў нават ня скончана давядзеньне цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных гаспадарак.

Отварэньне страхавых фондаў у асабасобных гаспадарках праходзіць вельмі марудна. Некаторыя калгасы—імя К. Маркса, Ленінскага сельсавету, «1 Мая», якіх ня скончылі малацьбы. Якіх горш з аўсткай насеньня і рамонтам інвэнтару. Да гэтай справы шмат сельсаветаў і калгасаў якіх ня прыступалі.

Кантрактацыя яравых засеваў у асноўным прынята сходамі на ўсім раёне. Гэта работа не праведзена толькі па Лячыкоўскім, Сераскім сельсаветах і па асобных пунктах іншых сельсаветаў. **Сяляне выносяць пастановы аб кантрактацыі 100 проц. сваіх засеваў. Але кантрактацыя не афарыляецца, давядзеньне пляну кантрактацыі да пасобных двароў не распачата.**

ВАРОНІН.

Абмежаваліся вынясеньнем пастановы

БРАГІНА. (Наш кар.).

Адозва партыі і ўраду аб кантрактацыі да гэтага часу не знайшла свайго адлюстраваньня ў рабоце калгасарыйных устаноў. Праўленьні райкалгасаюзу і райкамасаюзу абмежаваліся толькі вынясеньнем пастаноў, але практычных мер да рэалізацыі адозвы не прынялі.

Прапрацоўка адозвы аб канкрактацыі па лініі сельсаветаў амаль не распачата за выключэньнем Крыпчанскага. Не прапрацавалі адозву і калгасы «Чырвоны Кастрычнік», імя Варашылава, імя Дзяржынскага.

К.

Рэалізацыя адозвы не распачата

БЯГОМЛЬ. У Іканскім сельсавеце, Бягомльскага раёну, рэалізацыя адозвы партыі і ўраду аб кантрактацыі яшчэ не распачата. Работніцы сельсаветаў тлумачаць гэта тым, што... Бягомльскі РВК не даслаў їм належных інструкцый, што старшыня сельсавету ў водпуск.

Сяляне не паінфармаваны аб тых льготах, якія дае їм кантрактацыя.

Сельсавет давёў плян насеўкампаніі да двара, але не ўвязаў яго з кантрактацыяй.

Рабочая брыгада
ГЛАДКІ, ПІНУС.

Трэці год пяцігодкі— РАШАЮЧЫ І У СПРАВЕ КУЛЬТУРНАГА БУДАЎНІЦТВА

з дакладу т. Платуна на X зьезьдзе саветаў*)

Нашы ўсе культурасьветныя ўстановы, у прыватнасьці школы, здавальняюць запатрабаваньні ў тых разьмерах, як мы зараз расьцем, па абсалютуваньні ўсіх нац меншасьцяў, якія насяляюць БССР. Я магу прывесьці такія лічбы: у нас беларускіх школ сямігодак 73 проц., яўрэйскіх — 17 проц., польскіх—3 проц., расійскіх — 6 проц.; мы маем два яўрэйскія падтэхнікумы, сельска-гаспадарчы тэхнікум на яўрэйскай мове, прафшколы, фабзавучы і г. д.; мы маем адзін польскі падгатэчны тэхнікум, мы маем яўрэйскае аддзяленьне на рабфаках, на падфаку. Арганізавана польскае аддзяленьне і на рабфаку, на падфаку, у падінстытутах — адно з вакзы і два аддзяленьні ніча ў іншых інстытутах будуць арганізаваны з восені.

Мы навінны жорстка змагацца і з ідэалёгічнымі шкодніцтвам, а таксама шкодніцтвам, як контр-рэвалюцыйныя нацыянал-дэмакраты і насуп кулацкіх ворагаў, у культурным будаўніцтве нарабілі вельмі многа шкоды. Нам трэба на зьмест працы нашых школ абапрацца надзвычайна вялікую ўвагу. Школа — ёсьць сродак, які павінен шкодзіць рэвалюцыянэраў-барацьбітоў, а на Лёсіжак, Нікрамэвічах, Грамыках мы рэвалюцыянэраў-барацьбітоў ня выхаваем.

Чаму ў нас да гэтага часу няма добрай дзіцячай кнігі? А таму, што нашы пісьменьнікі ня пішуць. Нашы пісьменьнікі, на маёй думцы, надзвычай замкнуты ў сабе. Нашых пісьменьнікаў трэба, як сьлед, накрымсаваць.

Класавы вораг жахліва шалёнае супраціўленьне і ў культурным будаўніцтве. Класавым ворагам імкнецца сарваць усеагульнае навучаньне, ліквідацыю непісьменнасьці. Кансамы ворагі выкарыстоўваю ніча цэнтр працоўных мас, дзейнічае праз рэлігію. Мы маем выпадкі, напрыклад, у Рэчыцы і іншых раёнах, дзе сэктанты ня пускаюць сваіх дзяцей у школы. Сельсаветы не рэагуюць на гэту справу.

Ператварыць школу ў сапраўды палітэхнічную

Наша школа да гэтага часу была пераважна славянскай школай, школай, якая выпускала дзяцей часта зусім непрыстасаваных да працоўнага жыцьця. Мы ўсе ліся зараз за арганізацыю палітэхнічнай школы. Кансамол тут мае надзвычай вялікую заслугу. Кансамол першым паставіў пытаньне аб палітэхнічнай школе (раней яна называлася сялянскай), у якой былі б элементы палітэхніцы. Кансамол першы паставіў пытаньне аб фабрычна-заводзкай сямігодцы, якая таксама зьяўляецца школай палітэхнічнай. Кансамол таксама паставіў пытаньне аб школе фабрычна-заводзкага вучнёўства, якая зьяўляецца палітэхнічнай школай. Што-ж такое палітэхнічная школа? Вель мі часта нас налохваюць словам — палітэхнізм, але нічога абсалютна страшнага тут няма. Палітэхнізм заключае ў сабе тое, што вучань навінен апрача таго, што ён навучецца агульным ведам, навінен вывучыць асноўныя працэсы ўсіх відаў вытворчасьці, мець палітычны кругазід і набываць працоўныя навыкі. Вось што прадстаўляе сабою палітэхнічная асьвета. Органы НКАсьветы самі нічога ня могуць зрабіць у гэтай справе. Трэба, каб гэтай справай у першую чаргу заняліся наша прамысловасьць, гаспадарнікі. Калгасцэнтр, калгаснікі, рабочы, спэцыялісты прамысловасьці, спэцыялісты сельскай гаспадаркі. Наконт гэтага зьезд павінен будзе даць поўную дырэктыву.

Апошняе, таварышы, пытаньне аб навукова-дасьледчай справе. Тав. Горык—прэзыдэнт Акадэміі Навук правільна паставіў пытаньне аб канцэнтрацыі навукова-дасьледчай справы. У нас ёсьць 17 розных навукова-дасьледчых інстытутаў і ніхто дакладна ня можа сказаць: чым займаюцца гэтыя інстытуты. Мы ведаем, што 2 інстытуты — Акадэмія Навук і с.-г. інстытут займаліся ня нашымі справамі. У нас ёсьць такое здарэньне, што вывучае глебу і Акадэмія Навук і інстытут сельскай гаспадарці. Сядзяць спэцыялісты і тут і там і ніхто німа патрэбнага кіраўніцтва і вынікаў. Выдае Акадэмія Навук карту, выдае інстытут прамысловасьці і Дзяржплян. А чыя карта будзе правільнай—цяжка сказаць. Такое становішча, папершае, было таму, што ў нас сядзелі шкоднікі, а, па-другое, таму, што ня было аб'яднаньня навукова-дасьледчай працы, ня было падзелу функцый паміж асобнымі інстытутамі, ня было мэтаімкненьня ў адзін пункт.

Галоўнейшыя кадры нацыянал-дэмакратаў аб'ядналіся так званымі культурнымі работнікамі. Асноўнае шкодніцтва іх было ў культурным будаўніцтве: у Камісарыяце Асьветы, у Акадэміі Навук, у Дзяржвыдавецтве, у ВДУ, у с.-г. акадэміі. Мы мелі таксама выступленьні вялікарускіх шавіністаў, якія асабліва за гэтыя 2 гады пачалі актывізавацца.

Непрымірымасьць у змаганьні на два фронты супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, супроць беларускага контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму і іншых шавінізмаў—ёсьць неабходнейшая ўмова для пасьпяховага вырашэньня ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Нам трэба яшчэ больш узмацніць мабілізаваць увагу ўсіх працоўных мас кіруючых грамадзкіх арганізацый, прафсаюзаў, кансамолу, гаспадарчых арганізацый, Калгасцэнтру, калгасных арганізацый, мабілізаваць іх увагу на культурнае будаўніцтва, маючы на ўвазе, што барацьба за зьлікідаваньне культурнай рэвалюцыі гэта ёсьць барацьба за сацыялізм. (Вопіескі).

*) Пачатак гляді ў № 63 «Зьвязды».

Перад вачыма працоўных мас БССР і усяго Савецкага Саюзу за апошні час з усёй яўнасьцю быў укрыты малюнак разгорнутага шкодніцтва ў розных галінах народнай гаспадаркі і простай падрыхтоўкі ўзброенага нападу на савецкую дзяржаву з боку міжнароднага імпэрыялізму.

Матэрыялы, апублікаваныя ў сувязі з працэсам «прампартыі», «саюзнага бюро ЦК РСДРП(м)», выкрыцьцё «трудовой крестьянской партии» і контр-рэвалюцыйнай інтэлігенцкай групы беларускіх нацыянал-дэмакратаў—усё гэта пралівае яркае сьвятло на тое, як вакол пляцформы аддушэньня пралетарскай дзяржавы аб'ядналіся ўсе цёмныя сілы контр-рэвалюцыі, прадстаўнікі ўсіх ворожых пралетарыяту палітычных групоўкі, якія знаходзяцца як унутры Савецкага Саюзу, так і за яго межамі, пад апаратнымі кіраўніцтвам французкага і польскага імпэрыялізму.

Інтэрэсы кавалі зброю супроць краіны дыктатуры пралетарыяту, шкодніцкі, дыверсіянчы ролю сваіх гаспадароў, тварылі гэтую-ж злачынную справу ў тылу, імкнучыся аслабіць гаспадарчую магутнасьць Савецкага Саюзу, разбурыць яго з сярэдзіны.

Шкодніцтва, якое чэрпала сваю сілу з рэшткаў раней панаваўшых у царскай Расіі клас і груп тэхнічнай інтэлігенцыі, найбольш цесна зьвязаных з капіталізмам, зьяўляецца яркай формай праяўленьня клясавага змаганьня расійскай і міжнароднай буржуазіі з савецкай дзяржавай, лепшым доказам таго, што ні адна кляса, якая зыходзіць з сусьветнай арэны, не здае мірна сваіх пазыцый.

